УДК 94(476)“1919/1940”(093)+341.222(476)



**Сцяпан ЦЕМУШАЎ**

*Доктар гістарычных навук, дацэнт, прафесар кафедры гісторыі Расіі гістарычнага факультэта БДУ.*
*Сфера навуковых інтарэсаў: палітычная гісторыя славянскіх раннефеадальных дзяржаў, пераходны перыяд у развіцці славян ад родаплеміннога да дзяржаўнага ладу, развіццё палітычных інстытутаў сярэднявечнага грамадства.*
*Аўтар больш за 300 навуковых, вучэбных і метадычных прац, больш за 700 гістарычных карт.*



**Сяргей АЛЕКСАНДРОВІЧ**

*Кандыдат гістарычных навук, дацэнт, дацэнт кафедры гісторыі паўднёвых і заходніх славян БДУ.*
*Сфера навуковых інтарэсаў: гісторыя ваеннай справы, гісторыя славян у Сярэднія вякі, Новы і Навейшы час, гісторыя Вялікай Айчыннай вайны.*
*Аўтар больш за 60 навуковых, вучэбных і метадычных работ.*

# СТАНАЎЛЕННЕ дзяржаўных межаў Беларусі ў 1919—1940 гг.

**Упершыню спроба вызначыць дзяржаўныя межы беларускай нацыянальнай дзяржавы была зроблена ў афіцыйных дакументах, якія падрыхтавалі дзеячы ўрада Беларускай Народнай Рэспублікі. Аднак ва ўмовах германскай, а затым польскай акупацыі дзейнасць урада БНР мела фармальнае значэнне [1, с. 134—137]. Рэалізацыя ідэі стварэння беларускай дзяржаўнасці аказалася магчымай у форме савецкай рэспублікі, якая была абвешчана 1 студзеня 1919 г.**

**Ключавыя словы:** *Беларусь, ССРБ/БССР, дзяржаўные межы, тэрытарыяльныя ўзбуйненні*

Магчыма, на планаваныя межы новай дзяржавы разам з распрацоўкамі вучоных, якія займаліся вызначэннем этнаграфічных межаў беларускага этнасу, паўплывалі абвешчаныя ў Трэцяй Устаўной грамаце граніцы БНР, а таксама праект пераўтварэння Заходняй вобласці ў Беларуска-Літоўскую. Аднак у апошнім, са спасылкай на працы Я.Карскага, непамерна пашыраліся межы Беларусі, пры гэтым ён мог быць рэалізаваны толькі на падставе волевыяўлення літоўскага народа [2, с. 322]. Савецкая Заходняя вобласць, пазней — камуна, уключала Віленскую, Віцебскую, Магілёўскую, Мінскую і з красавіка 1918 г. Смаленскую губерні [3, с. 33—34].

У Маніфесце Часовага рэвалюцыйнага рабоча-сялянскага ўрада Беларусі ад 1 студзеня 1919 г., напоўненага рэвалюцыйнай патэтыкай, пытанне пра тэрыторыю ССРБ не закранаалася [4, с. 178—181]. Гэтаму пытанню была прысвечана спецыяльная пастанова I з’езда Камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі аб граніцах БССР ад 30 снежня 1918 г. Трэба звярнуць увагу на тое, што за аснову дзяржаўных граніц, як правіла, браліся межы губерній і паветаў часоў Расійскай Імперыі; яны ж першапачаткова стваралі і адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел савецкіх рэспублік. Напружаная сітуацыя на франтах хутка прывяла да змены межаў маладой беларускай савецкай дзяржавы. Згодна з рашэннямі ЦК РКП(б) ад 16 студзеня 1919 г. тэрыторыя ССРБ была паменшана на ўсходзе.

СТАНАЎЛЕННЕ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ Ў 1918 – 1921 гг.




## *Устаўная грамата Рады Беларускай Народнай Рэспублікі*

[...] Беларуская Народная Рэспубліка павінна абняць усе землі, дзе жыве і мае лічбеную перавагу беларускі народ, а ласьне: Магілёўшчыну, беларускія часьці Міншчыны, Гродзеншчыны (з Гроднай, Беластокам і інш.), Віленшчыны, Віцебшчыны, Смаленшчыны, Чарнігаўшчыны і сумежныя часьці суседніх губерняў, заселеныя беларусамі. [...]

Рада Беларускай Народнай Рэспублики
Дана ў Менску-Беларускім
25 сакавіка 1918 году

*Гісторыя Беларусі, 1917—1945 гг. : 10 кл. : хрэст. : дапам. для вучняў агульнаадукац. устаноў з беларус. і рус. мовамі навучання / аўт.-склад. А. А. Каваленя [і інш.] ; метад. забеспячэнне С. А. Кудраўцавай ; пад рэд. А. А. Кавалені. — Мінск : Пачатковая школа, 2009. — С. 31.*

## *Постановление I съезда коммунистической партии (большевиков) Белоруссии о границах Белорусской Советской Социалистической Республики*

*30 декабря 1918 г.*

1) Основным ядром Белорусской республики считаются губернии: Минская, Смоленская, Могилевская, Витебская и Гродненская с частями прилегающих к ним местностей соседних губерний, населенных по преимуществу белоруссами. Таковыми признать: часть Ковенской губернии Ново-Александровского уезда, Вилейский уезд, часть Свенцянского и Ошмянского уездов Виленской губернии, Августовский уезд бывшей Сувалкской губернии, Суражский, Мглинский, Стародубский и Ново-Зыбковский уезды Черниговской губернии. Из состава Смоленской губернии могут быть исключены уезды: Гжатский, Сычевский, Вяземский и Юхновский, а из Витебской губернии части уездов Двинского, Режицкого и Лютинского.

2) Во всех местах, где граница, проходя по части Витебской и Виленской губерний, носит спорный характер, вследствие населенности в одинаковой степени несколькими народностями, граница должна быть установлена особыми комиссиями, выделяемыми правительствами заинтересованных советских республик.

*Образование СССР. 1917—1924 : сб. док. — М. ; Л. : Изд-во АН СССР, 1949. — С. 114—115.*

Члены Цэнтральнага Камітэта партыі з удзелам У.І.Леніна палічылі неабходным правесці праз мясцовыя Саветы, а затым праз з'езд Саветаў Беларусі вылучэнне з ССРБ Смаленскай, Віцебскай і Магілёўскай губерняў. У складзе ССРБ заставаліся дзве губерні — Мінская і Гродзенская [5, с. 179]. Такім чынам, ад ССРБ былі адрэзаны і паветы Чарнігаўскай губерні. Зроблена гэта было без папярэдняга ўзгаднення з Саўнаркамам ССРБ. Спроба растлумачыць членам ЦК памылковасць прынятага рашэння не мела станоўчых вынікаў [3, с. 80—82]. У прынятай на І Усебеларускім з'ездзе Саветаў 3 лютага 1919 г. Канстытуцыі ССРБ звесткі пра дзяржаўныя межы адсутнічаюць [4, с. 187—190].

## *Из постановления ЦК РКП(б)*

*г. Москва* *16 января 1919 г.*

[…] 5. Вопрос о Белоруссии

Приняты следующие решения: 1. Для общеполитического руководства командировать в Белоруссию т. Иоффе. 2. Поручить ему провести через местные Советы, а затем через съезд Советов Белоруссии выделение из Белорусской Республики губерний Витебской, Смоленской, Минской, а в дальнейшем, в случае возможности, и Могилевской. 3. На съезде Советов Белоруссии 2 февраля провести предложение о начале переговоров об объединении с Советской Российской Республикой, для чего на съезде избрать комиссию. Съезд же должен взять на себя инициативу о начале таких же переговоров с Советской Российской Республикой о соединении с недавно образованными советскими республиками (Латвией, Эстляндией и Литвой и т. д.). С таковым предложением съезд должен обратиться к указанным республикам.

*Государственные границы Беларуси : сб. документов и материалов. В 2 т. / сост. В. Е. Снапковский [и др.]. — Минск : БГУ, 2012. — Т. 1. (март 1917 — ноябрь 1926). — С. 78.*

Абмежаваная тэрыторыя ССРБ ужо 24 лютага 1919 г. была аб'яднана з Літоўскай Савецкай Рэспублікай. Былі створаны сумесныя органы ўлады — урад (Саўнаркам), Савет абароны, ЦВК ЛітБел ССР, якія размяшчаліся ў Вільні, а з канца красавіка 1919 г. — у Мінску [6, с. 133]. Ва ўмовах вайны з Польшчай дакладна вызначыць тэрыторыю ЛітБел ССР не ўяўлялася магчымым, хаця гэта рабілася з-за патрэб працы, напрыклад, пошты і тэлеграфа.

## *Телеграмма управляющего делами временного правительства Литвы заместителю наркома почт и телеграфа Литвы и Белоруссии о составе ССРЛиБ*

*10 апреля 1919 г.*

В ответ на Вашу телеграмму по вопросу о границах Литовско-Белорусской Республики управление делами сообщает, что в пределы Литовско-Белорусской Республики входят бывшие губернии: Ковенская, Сувалковская, Виленская, Минская и Гродненская. Вопрос о Дисненском у. разрешен отрицательно, о Речицком у. — остается открытым. Поэтому пока следует воздержаться от пересылки переводов в указанные уезды.

Управляющий делами

За заведующего канцелярией

*Административно-территориальное устройство БССР : справочник : в 2-х т. — Минск : Беларусь, 1985. — Т. 1. (1917—1941 гг.) / составители: А. И. Карпачева и др. — С. 30.*

У Дэкларацыі аб абвяшчэнні незалежнасці ССРБ ад 31 ліпеня 1920 г. дакладнае вызначэнне тэрыторыі Беларусі адсутнічала.

## *Декларация о провозглашении независимости Советской Социалистической Республики Белоруссии*

*г. Минск* *31 июля 1920 г.*

[…] Социалистическая Советская Республика Белоруссия определяет свою западную границу по этнографической границе между Белоруссией и примыкающими к ней буржуазными государствами. Граница Социалистической Советской Республики Белоруссии с Советской Россией и Украиной определяется свободным выражением воли белорусского народа на уездных и губернских съездах Советов в полном согласии с правительством РСФСР и ССРУ. […]

*История Советской Конституции (в документах). 1917—1956. — М. : Гос. изд-во юридич. литературы, 1957. — С. 236.*

Заходняя граніца Беларусі па ўмовах Рыжскай дамовы




Праблема граніцы разглядалася ў дагаворы аб прэлімінарным міры з Польшчай ад 12 кастрычніка 1920 г. Цалкам заканамерна заходняя граніца Беларусі знайшла падрабязнае апісанне ў Рыжскім мірным дагаворы ад 18 сакавіка 1921 г. У абодвух дакументах гаворка ішла пра дамову паміж РСФСР і Украінай з аднаго боку і Польшчай з другога [3, с. 134—136, 160—165; 7, с. 429—430]. Заходняя частка Беларусі надоўга апынулася ў складзе Польшчы.

Поўны тэкст дагавора гл. у кнізе: *Документы и материалы по истории советско-польских отношений. — М. : Наука, 1965. — Т. III. (апрель 1920 г. — март 1921 г.). — С. 520—552.*

Далейшае дзяржаўнае будаўніцтва Беларусі звязана з тэрытарыяльнымі ўзбуйненнямі 1924 і 1926 гг. На іх правядзенні настойвалі ўрад БССР і іншыя кіруючыя органы. У якасці аргументаў высоўваліся тэзісы пра натуральнае, этнаграфічна-бытавое і эканамічнае адзінства тэрыторыі БССР і Гомельскай (створана ў красавіку 1919 г.), Віцебскай і часткі Смаленскай губерняў; неабходнасць стварэння адзінага гаспадарчага плана і кіраўніцтва для ўсёй гэтай тэрыторыі, якая адрозніваецца ад сумежных рэгіёнаў; больш спрыяльныя ўмовы аднаўлення эканамічнага жыцця, побыту, культуры Савецкай Беларусі, у склад якой будуць уключаны роднасныя суседнія раёны; перавагу ў складзе насельніцтва Віцебскай і Гомельскай губерняў беларусаў (адпаведна 65—68% і 80%; у Смаленскай губерні — 40%) [3, с. 185—186, 189—190, 182]. Галоўная асаблівасць арганізацыі ўлады і кіравання ў савецкай краіне абумовіла папярэдняе абмеркаванне і прыняцце рашэння аб змене граніц БССР партыйнымі органамі — ЦК УКП(б) і ЦК КП(б)Б. Дзяржаўныя (савецкія) органы зацвярджалі ўжо прынятыя рашэнні.

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ У 1921–1924 гг.




САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ У 1924–1926 гг.




## *Декрет Президиума Всероссийского ЦИК о передаче Белоруссии районов с преобладающим белорусским населением*

*г. Москва* *3 марта 1924 г.*

На основании постановлений 1-й Сессии Всероссийского Центрального Исполнительного Комитета XI-го созыва о передаче Белоруссии районов с преобладающим белорусским населением Президиум Всероссийского Центрального Исполнительного Комитета постановляет: передать Белорусской Советской Социалистической Республике:

1. Из состава Витебской губернии по границам старого административного деления уезды: Витебский, Городокский, Дриссенский, Лепельский, Оршанский, Полоцкий, Сенненский, Суражский.

2. Из состава Гомельской губернии уезды: Могилевский, Рогачевский, Быховский, Климовичский, Чериковский и Чаусский и волости Речицкого уезда: Дерновичская, Мухоедовская, Наровлянская, Дудичская со ст[анцией] Калинковичи, Крюковичская, ныне Савичская, Домановичская, Карповичская целиком и части волостей: Автютевичской, Юревичской и Якимо-Слободской по границам деревень: Боровики, Шепейки, Какуевичи, Александровка, Малые Автютевичи и деревня Домарка.

3. Из состава Смоленской губернии: Горецкий уезд полностью и волости: Шамовская, Старосельская, Казимирово-Слободская и части Бохотской, Ослянской и Соенской Мстиславльского уезда с городом Мстиславлем.

4. Передача указанных районов должна быть закончена в месячный срок на основе инструкций Всероссийского Центрального Исполнительного Комитета и Совета Народных Комиссаров о порядке передачи территории от 8 октября 1923 г. (Собр. узак. 1923 г., № 80, ст. 774).

5. Точные поволостные границы между Белорусской Советской Социалистической Республикой и губерниями: Смоленской, Гомельской и другими устанавливаются в месячный срок согласительными комиссиями в составе представителей этих губерний и Совета Народных Комиссаров БССР и утверждаются Президиумами Центральных Исполнительных Комитетов РСФСР и БССР.

*Государственные границы Беларуси : сб. документов и материалов. В 2 т. / сост. В. Е. Снапковский [и др.]. — Минск : БГУ, 2012. — Т. 1. (март 1917 — ноябрь 1926). — С. 265—266.*

### *Из постановления Президиума Всероссийского ЦИК о присоединении к БССР Речицкого и Гомельского уездов Гомельской губернии РСФСР*

*г. Минск* — *6 декабря 1926 г.*

Президиум Всероссийского Центрального Исполнительного Комитета постановляет:

1. Присоединить к Белорусской Социалистической Советской Республике из состава Гомельской губернии уезды Речицкий и Гомельский в их существующих административных границах, включая г. Гомель.

2. Гомельскую губернию ликвидировать, включив уезды Клинцовский, Стародубский и Новозыбковский Гомельской губернии в состав Брянской губернии.

3. Для установления точных границ между Белорусской ССР и Брянской губернией, а равно разрешения всех вопросов, связанных с присоединением к Белорусской ССР указанной в п. 1 настоящего постановления территории, образовать по соглашению с Центральным Исполнительным Комитетом Белорусской ССР Паритетную комиссию из представителей Белорусской ССР и РСФСР под председательством представителя Центрального Исполнительного Комитета Союза ССР.

Постановления Паритетной комиссии подлежат утверждению Президиумов Центральных Исполнительных Комитетов РСФСР и БССР. [...]

Председатель Всероссийского Центрального
Исполнительного Комитета М. Калинин
Секретарь Всероссийского Центрального
Исполнительного Комитета А. Киселев

*Государственные границы Беларуси : сб. документов и материалов : в 2 т. / сост. : В. Е. Снапковский, А. В. Тихомиров, А. В. Шарапо. — Минск : БГУ, 2013. — Т. 2. (ноябрь 1926 — декабрь 2010). — С. 21.*

Векапомнай, найвялікшай падзеяй у гісторыі беларускага народа стала ўз'яднанне Усходняй і Заходняй Беларусі [1, с. 395]. Вынікі вызваленчага паходу Чырвонай арміі ў верасні 1939 г. былі зацверджаны на Народным сходзе Заходняй Беларусі, які адбыўся 29 кастрычніка 1939 г. у г. Беласток, а затым законам СССР ад 2 лістапада 1939 г. тэрыторыя БССР павялічылася са 125,5 тыс. км² да 225,7 тыс. км².

БССР пасле Вызваляльнага пахода Чырвонай Арміі ў верасні 1939 г.



## *Закон Союза Советских Социалистических Республик о включении Западной Белоруссии в состав Союза ССР с воссоединением ее с БССР*

*г. Москва* *2 ноября 1939 г.*

Верховный Совет Союза Советских Социалистических Республик, заслушав заявление Полномочной комиссии Народного собрания Западной Белоруссии, постановляет:

1. Удовлетворить просьбу Народного собрания Западной Белоруссии и включить Западную Белоруссию в состав Союза Советских Социалистических Республик с воссоединением ее с Белорусской Советской Социалистической Республикой.

2. Поручить Президиуму Верховного Совета назначить день выборов депутатов в Верховный Совет СССР от Западной Белоруссии.

3. Предложить Верховному Совету Белорусской Советской Социалистической Республики принять Западную Белоруссию в состав Белорусской Советской Социалистической Республики.

4. Просить Верховный Совет Белорусской Советской Социалистической Республики представить на рассмотрение Верховного Совета СССР проект разграничения районов и областей между Белорусской Советской Социалистической Республикой и Украинской Советской Социалистической Республикой.

Председатель Президиума Верховного Совета СССР М. Калинин

Секретарь Президиума Верховного Совета СССР А. Горкин

*Государственные границы Беларуси : сб. документов и материалов: в 2 т. / сост. : В. Е. Снапковский, А. В. Тихомиров, А. В. Шарапо. — Минск : БГУ, 2013. — Т. 2. (ноябрь 1926 — декабрь 2010). — С. 80.*

У той жа час былі вырашаны пытанні пра ўсталяванне граніцы паміж БССР і УССР. Апошнія змены дзяржаўнай граніцы БССР перад Вялікай Айчыннай вайной былі звязаныя з перадачай некаторых тэрыторый Літве (са жніўня 1940 г. — Літоўскай ССР). У кастрычніку 1939 г. Літве былі перададзены г. Вільнюс (які стаў сталіцай паўночнай суседкі Беларусі пасля далучэння гэтай краіны да СССР) і Віленскай вобласці. Канчаткова беларуска-літоўская граніца ўсталявалася ў лістападзе 1940 г., калі да Літоўскай ССР адышлі некаторыя тэрыторыі БССР, у сувязі з чым спатрэбілася скасаваць 3 раёны — Гадуцішкаўскі, Парэчскі і Свянцянскі.

БССР напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны



## *Договор о передаче Литовской Республике г. Вильно и Виленской области и о взаимопомощи между Советским Союзом и Литвой*

*г. Москва* *10 октября 1939 г.*

Президиум Верховного Совета СССР, с одной стороны, и Президент Литовской Республики, с другой стороны, в целях развития установленных мирным договором от 12 июля 1920 года дружественных отношений, основанных на признании независимой государственности и невмешательства во внутренние дела другой стороны; признавая, что мирный договор от 12 июля 1920 года и договор о ненападении и мирном разрешении конфликтов от 28 сентября 1926 года по-прежнему являются прочной основой их взаимных отношений и обязательств; убежденные, что интересам обеих Договаривающихся сторон соответствуют определение точных условий обеспечения взаимной безопасности и справедливое разрешение вопроса о государственной принадлежности города Вильно и Виленской области, незаконно отторгнутых Польшей от Литвы, признали необходимым заключить между собой нижеследующий Договор о передаче Литовской Республике города Вильно и Виленской области и о взаимопомощи между Советским Союзом и Литвой и назначили для этой цели своими уполномоченными.

Президиум Верховного Совета СССР:

В. М. Молотова, Председателя Совета Народных Комиссаров и народного комиссара иностранных дел,

Президент Литовской Республики:

Юозаса Урбишса, министра иностранных дел, каковые уполномоченные, по взаимном предъявлении своих полномочий, найденных составленными в должной форме и надлежащем порядке, согласились о нижеследующем:

Статья I

В целях закрепления дружбы между СССР и Литвой г. Вильно и Виленская область передаются Советским Союзом Литовской Республике с включением их в состав государственной территории Литвы и установлением границы между СССР и Литовской Республикой согласно приложенной карте 1, причем более подробно эта граница будет описана в дополнительном протоколе. [...]

*Государственные границы Беларуси : сб. документов и материалов : в 2 т. / сост. : В. Е. Снапковский, А. В. Тихомиров, А. В. Шарапо. — Минск : БГУ, 2013. — Т. 2. (ноябрь 1926 — декабрь 2010). — С. 69—70.*

## *Указ Президиума Верховного Совета БССР об изменении границ отдельных районов Вилейской и Белостокской областей в связи с уточнением границы между Литовской и Белорусской ССР*

*г. Минск* *25 ноября 1940 г.*

В связи с передачей Литовской ССР части территории с преобладающим количеством литовского населения согласиться с предложением Вилейского и Белостокского областных исполнительных комитетов и внести следующие изменения в ранее установленные границы отдельных районов Вилейской и Белостокской областей БССР:

По Вилейской области

1. В связи с передачей Литовской ССР Свенцянского района исключить его из списка районов Вилейской области. Оставшиеся Лынтупский, Масляникский и Рынкянский сельсоветы Свенцянского района включить в состав Поставского района Вилейской области.

2. Упразднить как административную единицу Годутишковский район. Оставшиеся сельсоветы этого района: Камайский, Магунский, Новоселковский, Оцковичский, Полесский, Радутский и Старчунский включить в состав Поставского района Вилейской области.

3. Перечислить из Поставского района: Стародворский и Лучайковский сельсоветы в состав Дуниловичского района; Лотвинский и Нагавковский сельсоветы — в состав Мядельского района Вилейской области.

По Белостокой области

Упразднить как административную единицу Поречский район Белостокской области. В связи с этим:

1. Включить в состав Скидельского района Берштовский и Новорудский сельсоветы, ранее входящие в Поречский район.

2. Включить в состав Гродненского района Лихачский, Поречский, Плебанишковский и Привалковский сельсоветы, ранее входившие в Поречский район.

3. Перечислить из Гродненского района в состав Соколковского района Волкушский, Дубовский и Кузницкий сельсоветы.

*Государственные границы Беларуси : сб. документов и материалов : в 2 т. / сост. : В. Е. Снапковский, А. В. Тихомиров, А. В. Шарапо. — Минск : БГУ, 2013. — Т. 2. (ноябрь 1926 — декабрь 2010). — С. 105—106.*

*"Беларускі гістарычны часопіс" быў і застаецца для суполкі беларускіх гісторыкаў — у роўнай ступені і навукоўцаў, і педагогаў — найлепшай і найбольш пажаданай пляцоўкай для прадстаўлення вынікаў сваёй працы. З першага нумара "БГЧ" здабыў устойлівы інтарэс чытачоў, які не згубіўся на працягу трох дзесяцігоддзяў.*

*За часы сваёй дзейнасці часопіс захоўвае высокі навуковы ўзровень, безумоўную навізну і актуальнасць. Ён сапраўды з'яўляецца люстэркам развіцця беларускай гістарычнай навукі. Змешчаныя на яго старонках публікацыі дазваляюць падтрымліваць непасрэдную сувязь паміж навукай і адукацыяй. Найбольш важныя адкрыцці і дасягненні беларускіх гісторыкаў вельмі часта ўпершыню з'яўляліся менавіта на старонках "БГЧ". І тут жа ўбачыла свет першая канцэпцыя гісторыі Беларусі і нацыянальнай гістарычнай адукацыі.*

*Паважаныя супрацоўнікі "БГЧ"! Ваша плённая шматгадовая дзейнасць заслугоўвае самых цёплых слоў падзякі і самай высокай адзнакі. Ваш уклад у беларускую гістарычную навуку цяжка пераацаніць. Вы выхоўваеце моладзь нашай краіны, дапамагаеце настаўнікам гісторыі ў іх нялёгкай працы, падтрымліваеце прафесійны ўзровень спецыялістаў. Вашы яркія, цікавыя нумары, ніводны з якіх не паўтараўся, спалучаюць лепшыя традыцыі паліграфіі з інавацыйнымі рашэннямі. Не сумняваемся, што ў будучыні часопіс не раз здзівіць нас новымі яскравымі ілюстрацыямі і глыбокімі тэкстамі.*

*Жадаем стваральнікам часопіса захоўваць яго высокі статус, набыты шматгадовай працай. Хочацца пажадаць таксама ўсяму калектыву нашага "БГЧ" паспяховага развіцця, новых творчых ідэй, прадуктыўнага супрацоўніцтва, фінансавай стабільнасці, дабрабыту і росквіту, нязгаснай энергіі і аптымізму. Працягвайце прасвятляць і выхоўваць, здзіўляць і цешыць сваіх чытачоў доўгія гады!*

***З павагай, Сцяпан ЦЕМУШАЎ***

---

1. Гісторыя беларускай дзяржаўнасці : вучэбны дапаможнік для студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі / І. А. Марзалюк [і інш.]. — Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2022. — 447 с.

2. Круталевич, В. А. Рождение Белорусской Советской Республики (На пути к провозглашению республики. Октябрь 1917 — декабрь 1918 г.) / В. А. Круталевич. — Минск : Наука и техника, 1975. — 336 с.

3. Государственные границы Беларуси : сб. документов и материалов. В 2 т. / сост. В. Е. Снапковский [и др.]. — Минск : БГУ, 2012. — Т. 1. (март 1917 — ноябрь 1926). — 495 с.

4. История Советской Конституции (в документах). 1917—1956 гг. — М. : Госюриздат, 1957. — 1046 с.

5. Круталевич, В. А. Рождение Белорусской Советской Республики (Провозглашение республики. Развертывание национально-государственного строительства. Ноябрь 1918 — февраль 1919 г.) / В. А. Круталевич. — Минск : Наука и техника, 1979. — 336 с.

6. Органы местного управления и самоуправления на территории Беларуси (IX век — 30-е годы XX века) : пособие / Э. М. Савицкий [и др.] ; под общ. ред. С. Н. Ходина. — Минск : БГУ, 2019. — 199 с.

7. Документы и материалы по истории советско-польских отношений. — М. : Наука, 1965. — Т. III (апрель 1920 г. — март 1921 г.). — 610 с.

*Картаграфічныя матэрыялы выкананы С.Цемушавым.*

*Паступіў у рэдакцыю 22.02.2023.*